Шаноўны чытачу, не патрабуй ад мяне, калі ласка, тлумачэньня ці апраўданьня, чаму беларускі часопіс, якім ёсьць «ARCHE», ужо другі раз за сваю 12-гадовую гісторыю прысьвячае цалюткі нумар Чэхіі, ня кажучы ўжо пра менш ці больш аб'ёмістыя блокі чэскіх матэрыялаў, параскіданыя па іншых нумарах. Проста прымі гэта як дадзенасьць, разьняволься і атрымлівай асалоду, гартаючы старонкі новага «чэскага» «ARCHE». Хачу спадзявацца, што гэты нумар запомніцца, як запомніўся і той стары «Чэскі альбом» 2003 году, і ня толькі Міхалам Вівэгам, якога я сёлета і не падумаў уключыць у зьмест. Як мне здаецца, нумар, у якім надрукаваныя гэтыя радкі, дастаткова моцны, дастаткова роўны і дастаткова правакатыўны, якім і быў «ARCHE» ад самага свайго пачатку, і што — маю на ўвазе найперш правакатыўнасьць — так уласьціва чэхам, якія не пасьпелі ачоліць Эўразьвяз, як тут жа наскандалілі, прывёзшы ў Брусэль сваю «Энтропу». Вось і мне цікава, што скажаш ты, беларускі чытачу, на макаранічныя экспэрымэнты ад Бары Грэгаравай, едкую сатыру ад Яна Пэлца або маналёг прастытуткі ад Пэтры Гулавай.

Сучасная Чэхія — сьледам за ўсёй Эўропай — усё больш інтэрнацыяналізуецца. Наш чэскі нумар не адстае ў гэтых працэсах. Украінец Аляксей Сэўрук у ім аналізуе для беларусаў «Готлянд» — бэстсэлер паляка Марыюша Шчыгела пра чэхаў. Аўстрыячка Ангела Рогнэр, якая жыве пад Прагай, а працуе ў Брусэлі, піша пра чэскіх віетнамцаў ды ўкраінцаў. А Макс Шчур, якога мы прывыклі бачыць выключна беларускім аўтарам, выступае з апавяданьнем, напісаным ад пачатку па-чэску, для чэхаў і з чэскімі рэаліямі; і публікуем мы яго ў перакладзе Марыйкі Мартысевіч. А сам Макс — для большае разнастайнасьці — выступіў перакладчыкам на беларускую, сярод іншага, вершаў Алеша Шванцы *alias* Уласьціміла Станека, інсьпіраваных Менскам.

Кажу дзякуй усім, хто кансультаваў, пісаў (а на замову напісаная большасьць аналітычных тэкстаў), перакладаў, рэдагаваў, ілюстраваў, вярстаў, іншым чынам працаваў над нумарам. Тым, хто проста чакаў і дачакаўся. Прыемнага табе чытаньня!

*Сяргей Сматрычэнка, укладальнік*